біў прыязджаць з блізкага адсюль Кіева на Мазыршчыну. У Скрыгалаве жылі яго родзічы. Адзін з іх, Васіль Завітневіч, таксама вялікі патрыёт роднага краю, служыў свяшчэннікам скрыгалаўскай царквы. Вынікам цікавых размоў блізкіх па духу людзей з'явілася тое, што Уладзімір Зянонавіч вырашыў шукаць сляды далёкіх продкаў на поўдні Беларусі.

Нястомны даследчык за свае сродкі арганізаваў некалькі палескіх экспедыцый, выявіў каля 700 кurganоў, звыш 80 могільнікаў дрыгавічоў і палян. Толькі ў ваколіцах вёсак Барыскавічы, Лешня, Скрыгалаў, Слабада ў 1889 г. Завітневіч даследаваў больш за 200 старажытных курганоў, на 60 з іх правёў раскопкі. Ён знайшоў пахаванні далёкіх продкаў, шматлікія прадметы, якімі яны карысталіся,— посуд, нажы, крэсівы, жаночыя ўпрыгожанні і іншыя прадметы, што дазволілі зрабіць значныя вывады і адкрыцці ў галіне археалогіі. Вучоны вызначыў межы рассялення дрыгавічоў, іх этнічныя вызначальныя прадметы ў час нараджэння старажытнай дзяржаўнасці ў VIII—XII стст. Даследаваў ён не толькі Мазыршчыну — арганізаваў экспедыцыі і ў іншыя гарады Палесся.

Вынікамі археалагічных даследаванняў У. З. Завітневіча з'явіліся ягоныя кнігі: «У археалагічнай экскурсіі ў Прыпяцкае Палессе» (1890), «Другая археалагічная экскурсія ў Прыпяцкае Палессе» (1891) і іншыя. Матэрыялы даследаванняў і цяпер захоўваюцца ў археалагічных музеях Мінска, Кіева, Масквы.

Памёр У. З. Завітневіч у сакавіку 1927 г.

*М. Капач*

## У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

На пачатак XV ст. межы Вялікага княства Літоўскага распасціраліся ад Жмудзі (Жэмайціі — заходняй часткі сучаснай Літвы) і Падляшша на поўначы да прычарнаморскіх стэпаў на поўдні. Пры вялікім князю Вітаўце была захоплена тэрыторыя паміж вусцем Дняпра і Днястра, воіны княства выйшлі да берагоў Чорнага мора.

У складзе Вялікага княства Мазыр працягваў развівацца як гандлёва-рамеснае пасяленне, статус яго — «гаспадарскі горад», што азначае — Мазыр з'яўляўся маёмасцю дзяржавы.

Паступова паблізу Мазыра ўтвараліся «іншыя вясковыя пасяленні людзей». У дакументах XIII ст. з'явілася першае ўпамінанне аб Скрыгалаве. Каля 1432 г. упершыню ўпамінаюцца і вёскі Міхалкі, Барбароў, Мялешкавічы, у 1515 г.— Прудок.

У 1413 г. на Гродзенскім сейме ў Літве было вырашана стварыць ваяводствы па польскім узоры. Мазыр з ваколіцамі ўвайшоў у склад Мінскага ваяводства, якое падзялялася на тры паветы — Мінскі, Рэчыцкі і Мазырскі.

Мазырскія гандляры ў XV ст. мелі вялікія сувязі, прыпяцкі гандлёвы шлях звязваў іх з Кіевам, Пінскам, Брэстам, а праз гэтыя гарады — з Масковіяй, Польшчай, Прыбалтыкай. Але ўлада вялікага літоўскага князя не магла абараніць горад і навакольныя вёскі ад разбурэнняў, якія адбываліся ў час частых набегаў крымскіх і нагайскіх татар — у 1497, 1521 і нават 1534 гг.

Час быў вельмі нялёгкі, амаль штогод неўраджай, частыя татарскія набегі. Вясною 1498 г. пачаўся голад. Яшчэ больш цяжкім аказаўся апошні набег ворагаў. П. М. Шпілеўскі пісаў: «З першых гадоў улады Сігізмунда I перакопскія татары пачалі трывожыць заходнерускі край Мазыр, адзін з першых гарадоў, які стаў ахвярай заваёўнікаў. Татарскія набегі на Мазыр нарадзілі герояў, сярод якіх народныя песні праслаўляюць храбрасць бясстрашнага Базара, родам з Грэцыі. Базар не раз граміў татараў,

ва ўзнагароду за гэта ад Сігізмунда атрымаў маёнтак Іпагор, што знаходзіўся недалёка ад Мазыра. Праз два гады татары захапілі Базара ў палон і забілі. Іпагор перайшоў ва ўладанне другога храбрага воіна, Дзям'яна Ленкі, якога называлі Ленка Іпагорскі. Прозвішча Ленка, пазней – Лянкевіч, вядомае на Мазыршчыне тым, што адзін з Лянкевічаў быў першым мазырскім старастам. У 1534 г. татары зноў спалілі горад, перарэзалі ўсіх жыхароў. Мазыр перастаў існаваць як горад на працягу амаль стагоддзя – да 1609 г. ...»

Звесткі аб гібелі горада ад татарскага набегу, магчыма, перабольшаны аўтарам.

Пад уражаннем татарскага нападу на Кіеў у 1482 г. староста Міхаіл Гашны пабудаваў Мазырскі замак і ўдасканаліў былы гарадскі дзядзінец. Першыя датаваныя сведкі пра гарадскі замак адносяцца да 1509 г. Ён складаўся з трох вежаў за ўмацаваным парканам, злучаных агароджай, і некалькіх збудаванняў між імі, якія таксама выконвалі абаронную ролю. У замку знаходзілася царква св. Спаса, некалькі жылых і гаспадарчых пабудоў, калодзеж. Рэшткі аднаго з будынкаў знойдзены пры раскопках паўночнай часткі замчышча.

У 1507 г. пачалася вайна з Рускай дзяржавай. Частка беларускіх і ўкраінскіх феадалаў на чале з Міхаілам Глінскім спрабавала перайсці ў падданства маскоўскага князя. Глінскі адкрыта выступаў супраць Сігізмунда І. Глінскага падтрымалі жыхары Мазыра, Гомеля, Бабруйска і іншых гарадоў. Па некаторых звестках, ён пры падтрымцы рускіх войск захапіў Мазыр і ў 1508 г. тайна заключыў тут пагадненне з крымскім ханам Менглі Гірэем.

Не паспеў горад адбудавацца пасля пагромаў, нанесеных перакопскімі татарамі ў 1521 і 1534 гг., як пачалася новая вайна з Масквой. Маскоўская раць пад кіраўніцтвам князя Фёдара Аўчыны – Целяпнёва-Абаленскага рушыла са Старадуба ў паход на захад, знішчыла ваколіцы Магілёва, Турава, не ўступаючы па лютасці татарам. У 1536 г. быў разбураны Мазыр.

Але горад працягваў існаваць, пра гэта сведчаць апісанні маёмасці, якія былі праведзены ў 1552 і 1576 гг. у Мазырскім замку. Намеснікам польскага караля мазырскім старастам Мікалаем Падляцкім быў адноўлены замак. Староста зазначаў, што ён будзе сімвалам вечнага ўладання тут польскай кароны.

Пабудова ўяўляла ўжо ўмацаванне. На ўзбраенні мелася 10 гармат (5 вялікіх і 5 малых), 53 гакаўніцы, дастатковая колькасць ядраў, свінцу і серы. Да замка былі прыпісаны дзве валасці: Мазырская (28 сёл) і Бчыцкая (14 сёл). У дакументах упамінаюцца Мялешкавічы – 29 мужчын, Барыскавічы – 13, Скрыгалаў – 28 мужчын і 2 удавы, Касцюковічы – 17 мужчын...

Мазырская воласць займала тэрыторыю ад р. Пціч на захадзе да р. Віць на ўсходзе. Мазырскі замак лічыўся дзяржаўным, на яго працавалі не толькі мазырскія мяшчане, але і сяляне прыпісаных да замка валасцей. Мяшчанскае насельніцтва горада і сяляне валасцей неслі на карысць замка шэраг павіннасцей, акрамя таго – цяглае. Насельніцтву патрэбна было плаціць таксама пазямельны падатак. Мяшчане мелі магчымасць нарыхтоўваць дровы, лес для будоўляў, касіць сена. 30 мяшчанскіх двароў мелі ворную зямлю, якую яны арандавалі і куплялі ў вакольных сялян. За гэтыя надзелы яны плацілі подаць куніцамі і 7 грошаў. Тыя, у каго не было ворнай зямлі, плацілі «паваротшчыну» – падворную подаць па 1 грошу і 2 пенязі.

Для патрэб замка бралі дарожную пошліну – «мыта вадзяное» (з гандляроў, што плылі па рацэ), а таксама з тых, хто ездзіў «сухой дарогай». Меліся пабудаваць мост цераз Прыпяць, для яго патрэб з воза бралі 0,5 гроша, а калі везлі соль, рыбу, гарэлку, то асобную плату.

Склад гарадскога насельніцтва на мяжы Беларусі і Украіны быў разнастайны і непастаянны, некаторых жыхароў называлі «прахожымі». Па запісу 1552 г. у Мазыры жыло 1500 чалавек, з іх мяшчане падзелены на тры групы: нізавыя – 73, мужчынскага полу (да іх адносілася адна ўдава дадаткова), верхавыя – таксама 73, сярэднія – 53 чалавекі. Баярскіх людзей зарэгістравана 53, слуг – 5.

Паводле «Статусу на валокі» Сігізмунда II Аўгуста, прынятага ў 1557 г., у сялян адразалі зямлю. Нормай надзелу для адной гаспадаркі была валока зямлі (21,3 га), разбітая на тры палі. Бednякі атрымалі надзелы ў паўвалокі. Дварышчы распадаліся на асобныя «дымы», якія звычайна складаліся з

дзвюх простых сем'яў (бацька і жанаты сын, два сыны і г. д.). Устанаўлівалася паншчына: 2 дні ў тыдзень з валокі, плата аброку грашыма і прадуктамі. Селянін пазбаўляўся права пераходу да другога феадала, павінен быў аддаваць дзесяціну на карысць царквы, выконваць дзяржаўныя павіннасці (рамонт замкаў, дарог, перавозкі і інш.). Жыхары Мазыра адмовіліся плаціць натуральныя павіннасці, матывуючы гэта наступным чынам: «Мы, как люди городские, будем жить торговлей, ремеслом и рекой». Гэтая з'ява сведчыць пра тое, што ў сярэдзіне XVI ст. горад, нягледзячы на свае невялікія памеры, пачынае выдзяляцца з сялянскай акругі.

У 1564 г. у склад Мазырскага павета ўвайшла Брагінская воласць. З 1566 г. Мазырскі павет па рэформе Вялікага сейма перайшоў у склад Кіеўскага ваяводства. Але пасля прыняцця Люблінскай уніі і ўтварэння ў 1569 г. Рэчы Паспалітай — аб'яднанай польска-літоўскай феадальнай дзяржавы, куды ўвайшлі беларускія і ўкраінскія землі, Мазыр зноў становіцца павятовым цэнтрам Мінскага ваяводства.

У снежні 1576 г. у гарадскім замку пад кіраўніцтвам Матэвуша Вазніцкага была праведзена інвентарызацыя.

У справаздачы аб ёй чытаем: «Спачатку, ля ўвахода ў замак, першая вежа каля замкавых варот, з левага боку з 6 выпраўленымі ярусамі (вароты замка знаходзіліся ў пачатку сучаснай вуліцы Гара Камунараў, насупраць ваенкамата). Другая вежа, па левы бок ад увахода ў замак — з 6 ярусамі, 2 без насцілаў. Трэцяя вежа — Пцічская, на ёй купал, накрыты белай бляхай, 6 ярусаў, толькі 3 з насціламі. У гэтай вежы святліца з печчу, вокны без шкла. Таксама ў 6 ярусаў, 5 з насцілами і чацвёртая вежа, з аднаго боку якой — святліца, насупраць яе — клець без шкла, з другога боку вежы — другая святліца з печчу, насупраць — пакой з вокнамі без шкла. З правага боку — пятая вежа з 6 цэлымі ярусамі. Пасярод замка — царква св. Спаса, перад царквою на ганку — звон. Знізу 2 святліцы з печамі, вельмі дрэннымі, і 2 клеці падгнілыя, без шкла. Трэцяя вялікая святліца незашклёная каля самай зямлі. Насупраць яе — сенцы з абадранаю страхою. Грыдніца ў замку таксама з абадранай страхой, насупраць яе — кухня. Калодзеж крыты, з адным вядром. З добрых свірны, адзін пограб добры, другі завалены. Усё ў замку, як вежы, так і сцянныя зубцы, у значнай частцы не пакрыты.

Агнястрэльная зброя ў замку — медная гармата, якая стаіць каля варот, у 9 з паловай пядзяў, другая гармата на той жа вежы; каля варот таксама гармата ў 9 з паловай пядзяў, трэцяя ў той жа вежы на трэцім ярусе — у 13 пядзяў, чацвёртая — па правы бок ля ўвахода ў замак, у 9 з паловай пядзяў. Усе гарматы стаяць на акаваных калёсах з усімі прыналежнасцямі. Тры акаваныя жалезныя малакаліберныя гарматы. Старая жалезная гармата ў 3 пядзі прывязана да лафета. Жалезная ступа, каб здрабняць порах, 46 пішчаляў. Клець, абмазаная глінай, для захоўвання пораху, 2 рыбныя бочкі і палова бочачкі пораху. Порах для пішчаляў — першая бочка няпоўная на тры кольцы, другая няпоўная на пядзю, трэцяя няпоўная на далонь, чацвёртая — поўная, пятая бочка на пядзю, але бочкі не аднолькавыя, вялікія, таксама мазырскія рыбныя. Порах для ружжаў — першая бочка на далонь няпоўная, другая бочка ў куце каля яе зусім поўная, трэцяя і чацвёртая на далонь няпоўныя. У пятай бочцы, таксама рыбнай мазырскай, больш паловы серы... Ядраў на дзвюх вялікіх гармат каменных — 190 аднаго калібра, да трэцяй гарматы доўгай — 22 ядры, аблітыя свінцом, да яе ж і 4 каменныя ядры. Да чацвёртай малой гарматы, якая знаходзіцца ў вежы, справа ад увахода ў замак, 20 ядраў, аблітых свінцом. Малых ядраў, аблітых свінцом, для малакаліберных гармат — 18. Куль для пішчаляў — 600, падпорак гарматных — 18, 2 жалезныя кліны ляжаць каля ядраў. 11 парахаўніц для пішчаляў.

Мост да замка высокі, стары, моцна пашкоджаны, пешшу па ім не пройдзеш. Перад замкам — дзве святліцы, адна насупраць другой, у якіх бэлькі падгнілі, няма печаў і часткова даху, няма шкла. Пякарня і насупраць яе кухня з абадраным дахам. Канюшня з аднаго боку падгніла...»

Згодна з дакументам, у Мазыры налічвалася 550 дамоў, рынак з 44 каморамі (лаўкамі), 5 цэркваў, шпіталь. Насельніцтва горада — каля 2 тысяч чалавек.

28 студзеня 1577 г. кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый падпісаў грамату, па якой Мазыр удастойваўся Магдэбургскага права — некаторай самастойнасці ў кіраванні.

Па Магдэбургскаму праву парадак выбараў у органы самакіравання ў Мазыры быў аднаступенчатым: мяшчане з войтам выбіралі ўвесь склад гарадской улады. Гэты орган самакіравання на чале з бургамістрам збіраўся не радзей як адзін раз у тыдзень «ці столькі, колькі будзе неабходна». Гарадскім войтам

быў назначаны падкамарый віленскі — Мікалай Ясінскі, якому была дадзена поўная ўлада «па ўсіх справах аб крымінальных злачынствах». У дапамогу войту гараджане павінны былі выбіраць чатырох асоб, якія пастаянна жылі ў горадзе. Мазыру была «даравана» ўласная пячатка. Гарадское насельніцтва мела права высечкі ў лесе дрэў для гаспадарчых патрэб — на чатыры мілі вакол Мазыра. У дадатак да рыначнага гандлю, які праводзіўся кожную пятніцу, былі зацверджаны два кірмашы ў год: у жніўні ў дзень святога Іллі і ў студзені на святога Васілія.

Пасля заключэння ў 1596 г. Брэсцкай царкоўнай уніі кароль Рэчы Паспалітай Сігізмунд III даў рускаму духавенству Мазыра поўную свабоду ад ваяводы і «ўсялякіх грамадзянскіх улад», што на гэты час было актам выключнай верацярпімасці. Але не ўсё было добра ў жыцці гараджан і вяскоўцаў. Летапісец пісаў у 1587 г.: «Мало не пуста земля была ... неурожай, голоды великие, болезни, мор, лета ненастные, неурожайные...» А тут яшчэ пастоі войскаў. У 1596 г. у Мазыры стаяў гетман Палоус, казакі прынеслі жыхарам многа крыўд і разбурэнняў. У «Геаграфічным слоўніку каралеўства Польскага» ў 1885 г. паведамлялася: «Около 1603 г. произошло великое бедствие в Мозыре. Управлял тогда староством некто Полонский, привлеченный якобы сокровищами местных замковых стен, приблизил к себе замковую казну и, предав огню замок и город, пропал без вести. Выгорел тогда замок и город полностью, закрыл тайну низкого поступка в пожарищах и руинах, так как Полонский исчез бесследно, оставив только домыслы для истории».

На пачатку XVII ст. мяшчане Мазыра прынялі рашучыя меры супраць феадалаў, якія мелі вока на горад. Прычынай незадаволенасці быў мазырскі стараста, які падпарадкаваў частку мяшчан горада, аб'явіўшы іх сваімі падданымі: «...яны знаходзяцца пад юрысдыкцыяй замка, гэта значыць пазбаўлены Магдэбургскага права ...» 3 кастрычніка 1615 г. даведзеныя да адчаю феадальнымі паборамі, самавольствамі гарадскога старасты, замкавай адміністрацыі і арандатараў жыхары Мазыра, на чале з бургамістрам Жданам Мушам, гараджанамі Іванам Крыцкім, Іванам Валчковым, Астапам Лаўрыновічам і іншымі, узброіліся і захапілі замак. У сутычцы былі забіты тры прадстаўнікі замкавай адміністрацыі і некалькі арандатараў. Улада перайшла ў рукі магістрата, але да поўнай перамогі было далёка. Каралеўскі намеснік не захацеў вярнуць пад юрысдыкцыю магістрата тую частку жыхароў Мазыра, якую ён хацеў падпарадкаваць сабе. Летам 1616 г. мазыране зноў узяліся за зброю і напалі на замак, да іх далучыліся жыхары навакольных вёсак. З вялікай цяжкасцю каралеўскім войскам і шляхце ўдалося падавіць паўстанне, але праз некалькі месяцаў яно разгарэлася з большай сілай. Яго ўдзельнікам стала ў асноўным гарадская бедната, ці, як гаворыцца ў дакументце, «люди свовольные, людные». Мяшчане арганізавалі атрад у некалькі соцень чалавек. Паўстанцы адмовіліся плаціць пошліны і паборы ў казну, арыштоўвалі жыхароў горада, якія не прымалі ўдзелу ў паўстанні. Гнеў паўстанцаў быў скіраваны на арандатараў і шляхту. Шляхце з ваколіц было забаронена выязджаць у горад пад страхам смерці. Акружыўшы замак, паўстанцы захапілі ўладу, выбралі войта, захапілі казну. Паборы, якія паступалі ў казну, накіравалі ў даход горада.

Паўстанне гараджан Мазыра, якое пачалося як барацьба за захаванне іх саслоўных прывілей, разгарнулася ў сацыяльна-палітычны рух гарадскіх нізоў супраць феадальнага класа і гарадской вярхушкі. Але вынікамі перамогі паўстанцы доўга карыстацца не маглі. Некалькі месяцаў цягнуўся судовы разгляд у велікакняжацкім судзе. Паўстанцы абвінавачваліся, акрамя ўсяго іншага, у тым, што «з-за бунту некалькі

месяцаў не засядаў замкавы суд». Усё ж улады вымушаны былі пайсці на некаторыя ўступкі. У 1622 г. суд прыняў рашэнне: мяшчане, якія знаходзіліся пад уладай замка, атрымалі Магдэбургскае права і перадаваліся пад юрысдыкцыю гарадскога самакіравання. На карысць горада аддавалася частка збораў з гандлю і рамесніцтва. У 1588 г. быў прыняты трэці Статут Вялікага княства Літоўскага, які юрыдычна аформіў запрыгоненне беларускіх сялян, а ў кастрычніку 1596 г. у Брэсце была заключана царкоўная унія, якая фактычна паставіла ў Рэчы Паспалітай праваслаўную царкву ў залежнасць ад каталіцызму. Да эканамічнага і нацыянальнага прыгнёту дабавіўся і рэлігійны — гвалтоўнае насаджэнне каталіцкай веры сярод жыхароў Мазыра і Мазырскага павета, бо тутэйшае насельніцтва ў большасці было праваслаўным.

Незадаволенасць народа феадальнымі паборамі, узмацненне нацыянальнага і рэлігійнага гнёту расло. У 1648 г. гэта вылілася ў нацыянальна-вызваленчую вайну, якая разгарнулася на Украіне і ў Беларусі. Асноўнай сілай паўстанцаў былі запарожскія казакі пад кіраўніцтвам гетмана Багдана Хмяльніцкага. Сваю ролю ў гісторыі «казацкіх войн» адыгралі і жыхары Мазыршчыны.

Паўстанне, якое пачалося на Украіне, перакінулася на тэрыторыю Беларусі. Узняліся многія беларускія гарады, у ліку першых — Брэст, Пінск, Тураў, Мазыр. Багдан Хмяльніцкі надаваў гэтаму вялікае значэнне,— беларускія гарады прыкрывалі правы фланг войска казакаў і прыцягвалі значныя ваенныя сілы Рэчы Паспалітай. На дапамогу беларусам ён прыслаў атрады казакаў на чале з Галавацкім, Крывашапкам, Мікуліцкім, Гаркушам, Сакалоўскім, Гутам і іншымі атаманамі. Разумелі значэнне гэтых гарадоў і ў Рэчы Паспалітай, сюды накіраваў першыя ўдары свайго войска віленскі польны (пагранічны) ваявода Януш Радзівіл. Яго харугвы, якія складаліся з наёмнікаў і шляхты, разлічвалі, захапіўшы Тураў, Пінск і Мазыр, перарэзаць шляхі казацкім атрадам з Украіны на Беларусь, скіраваць удар на фланг і тыл войска Хмяльніцкага. Да пачатку лета 1648 г. Мазыр стаў важным пунктам сканцэнтравання атрадаў паўстанцаў, байцамі якіх станавіліся жыхары горада, сяляне навакольных вёсак. Іх узначаліў мазырскі рамеснік Іван Столяр. Гараджане складалі асобую харугву на чале з рамеснікам Седляром.

У пачатку жніўня ў Мазыр прыбыў пасланы Хмяльніцкім двухтысячны атрад атамана Яна Сакалоўскага, які пайшоў адсюль на Слуцк. На змену яму прыйшлі казакі палкоўніка Міхненкі, што знаходзіліся на Тураўшчыне. Атрад шляхты і наёмнікаў пад кіраўніцтвам Баловіча быў разбіты нечаканым ударам каля Мазыра, рэшткі яго разбегліся. Мазырскія паўстанцы аб'ядналіся з казакамі Міхненкі, расправіліся з прыхільнікамі каталіцкай царквы і старой улады.

Захапіўшы ў кастрычніку 1648 г. Пінск, войскі Радзівіла накіраваліся трыма калонамі ўздоўж берагоў Прыпяці на ўсход. Каля Нобеля да яго далучылася войска Мірскага. Шляхціцы мелі звесткі аб тым, што да канца жніўня — пачатку верасня сілы паўстанцаў у Мазыры складалі «400 человек из черни здешних краёв. Среди этих 400 набрана одна хоругвь из самого города». Колькасць казакаў сярод паўстанцаў, як здавалася Радзівілу, была невялікай. 18 студзеня 1649 г. харугвы шляхціцаў і наёмнікаў падышлі да Турава. У горадзе знаходзілася каля 2 тысяч паўстанцаў, кіраўніком якіх быў Кандрат Цэўка — «палкоўнік тураўскі». У яго атрадзе налічвалася каля чатырохсот казакаў. Жыхары Турава, даведаўшыся аб падыходзе да горада вялікіх сіл праціўніка, адышлі да Мазыра без бою.

Пакінуўшы ў Тураве абоз, Радзівіл рушыў уніз па Прыпяці, да Мазыра. Шэсць лёгкіх харугваў ён накіраваў

у Оўручскі брод, каб не даць магчымасці падысці падмацаванням з Украіны і перарэзаць шляхі адступлення паўстанцаў. Захапіўшы Скрыгалаў і Скрыгалаўскую Слабаду, Радзівіл выслаў да Мазыра разведку — адну з асабістых харугваў.

Размешчаны на правым беразе Прыпяці, па вяршынях і схілах узвышша, Мазыр быў добра ўмацаваны. На самым высокім месцы ўзвышаўся драўляны замак, вежы якога былі злучаны сценамі вышынёй ад 8 да 10 метраў з тоўстых дубовых бярвенняў, абмазаных са знешняга боку глінай. Вакол замка — высокі вал і роў, праз які быў перакінуты мост, што злучаў крэпасць з пасадам. Па схілах узвышша вакол замка — дамы, лаўкі, майстэрні, гаспадарчыя пабудовы пасада. З трох бакоў горад, як і замак, абнесены драўлянай сцяною, валам і глыбокім ровам — да 10 метраў. З боку высокага і абрывістага берага Прыпяці ўмацаванняў не было. Хвалі ракі пляскаліся там, дзе зараз размешчана набярэжная вуліца, а плошчы, што акружаюць Замкавую гару, былі залівамі Прыпяці...

Мазырскія і тураўскія паўстанцы рыхтаваліся да бою, умацоўвалі гарадскія і замкавыя сцены, вуліцы перагароджвалі ледзянымі глыбамі і драўлянымі зрубамі, запоўненымі зямлёй. Перад гарадской сцяной былі пабудаваны дадатковыя ўмацаванні з завостранымі бярвеннямі, укапанымі ў зямлю. Схілы валоў і бастыёны паўстанцы залілі вадою, уздоўж берага Прыпяці былі прасечаны шырокія палонкі. З гэтага боку да горада немагчыма было падступіцца.

Радзівіл накіраваў да паўстанцаў ганца з пісьмом, у якім патрабаваў адмовіцца ад супраціўлення і даць магчымасць яго войску ўвайсці ў горад, за што абяцаў гараджанам і казакам дазволіць свабодны выхад з горада. Але мазыране ўжо ведалі цану такім абяцанням: жыхары Турава і Пінска паверылі і па загаду Радзівіла былі знішчаны. Прапанова аб капітуляцыі была адхілена, а ганца закавалі ў ланцугі і пасадзілі ў склеп.

Харугвы, пасланыя ў бок Оўручскага броду, падышлі да Мазыра з поўдня і спыніліся на адлегласці каля мілі ад горада ў вёсцы Наружавічы (магчыма, цяперашнія Булаўкі ці Бабраняты). Паўстанцы на чале з Міхненкам зрабілі вылазку з асаджанага горада. Па паведамленні шляхціца Багуслава Машковіча, які знаходзіўся ў войску князя ў якасці храніста, наёмнікі і шляхціцы, якіх заспелі нечакана, ледзь уцяклі. Іх сцяганосец бег босы. Каля Наружавічаў драгуны стрымалі атрад Міхненкі, паўстанцы вымушаны былі вярнуцца ў горад.

У сярэдзіне студзеня харугвы Радзівіла падышлі да Мазыра і акружылі яго. На досвітку 20 студзеня ваявода загадаў пачаць штурм горада. Шляхта рынулася ў наступ, але атака не мела поспеху. Вораг панёс вялікія страты і быў адкінуты ад гарадскіх сцен. Спроба ўварвацца з другога боку таксама скончылася няўдачай. Не прынеслі поспеху і атакі на пазіцыі мазыран і казакаў у конным страі. Тады Радзівіл загадаў войску спешыцца і пасля абстрэлу горада з гармат пачаў штурм з трох бакоў. Паўстанцы некалькі разоў адкідвалі ворагаў ад сцен, але доўга супрацьстаяць прафесійнай арміі не маглі. Драгуны пад прыкрыццем саней, нагружаных дровамі, наблізіліся да варот (па ўсёй верагоднасці, з боку цяперашняй вуліцы Фрунзе), выбілі іх цяжкім бервяном і ўварваліся ў горад. На вуліцах пачаліся жорсткія рукапашныя баі. Наёмнікі і шляхціцы адціснулі паўстанцаў ад гарадской сцяны, яны паміралі ва ўпартых баях, абараняючы кожны дом і барыкаду.

На зыходзе дня ворагі ўварваліся ў замак. Адна з груп паўстанцаў была адкінута на бераг Прыпяці і прыціснута да палонак, дзе адбылася апошняя адчайная бойка. Мазыране змагаліся да апошняга, гінулі ў ледзяной вадзе, але ў палон не здаваліся.

Адзін з кіраўнікоў паўстання, Сяд-

ляр, выкарыстаўшы цемру, вырваўся на кані з горада. Драгун ледзь не дагнаў яго, нават узняў шаблю, але конь аступіўся, і ён вылецеў з сядла. Конь драгуна пабег за паўстанцам, той пераскочыў на яго і ўцёк.

Асабліва вызначыліся сваёй жорсткасцю ў час штурму Мазыра камандзіры харугваў Н. Гонзеўскі і К. Тузенгаўз. Ворагі захапілі параненага палкоўніка Міхненку. Радзівіл загадаў скінуць яго з самай высокай, Пціцкай вежы замка, адсечаную галаву казацкага атамана насадзілі на піку гарадскіх варот.

Ворагі палілі дамы ў горадзе, жорстка распраўляліся з яго жыхарамі, дабівалі параненых. Па загаду Радзівіла замак быў падпалены. Што не згарэла ў агні — каменне падмуркаў, сцен і вежаў, кафля і чарапіца, бляха і рэшткі драўляных сцен, людзі разабралі на аднаўленне дамоў і гаспадарчых пабудоў. Мазырскі замак больш не аднавіўся.

Войска Радзівіла стаяла лагерам каля Мазыра на працягу тыдня, залечваючы атрыманыя ў час штурму раны. Наёмнікі і шляхціцы рабавалі не толькі горад, але і вакольныя вёскі, забівалі сялян, якія прымалі ўдзел у паўстанні. Затым з прыбыўшымі з Турава абозамі войска накіравалася ў напрамку Бабруйска на дапамогу паўтаратысячнаму атраду харунжага Валовіча.

Шляхце не ўдалося запалохаць беларусаў. Барацьба за незалежнасць працягвалася. Пасля Пераяслаўскай Рады ў 1654 г. разгарэлася новая вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Пасланы з Кіева на Беларусь казацкі атрад падышоў 7 ліпеня таго ж года да Мазыра. Шляхціцы на чале з ротмістрам Паўшам уцяклі ў Петрыкаў. Жыхары Мазыра адчынілі казакам гарадскія вароты і прысягнулі на вернасць Расіі. Казакі не затрымаліся ў горадзе, праз некалькі дзён яны вярнуліся ў Кіеў.

Мазыршчына трапіла на некаторы час у зону дзеянняў рускіх войск. У 1659 г. Мазыр быў заняты атрадамі маскоўскага ваяводы Валконскага і знаходзіўся пад яго ўладай.

Па Андрусаўскім перамір'і 1667 г. Мазыр застаўся пад уладай Рэчы Паспалітай. У перыяд «казацкіх» войнаў горад вельмі пацярпеў, колькасць насельніцтва ў ім значна скарацілася. Пры каралі Яне Сабескім у 1676 г. была прынята пастанова аб бестэрміновым вызваленні Мазыра ад усякіх праходаў і пастояў войск. Між тым хваляванні на Мазыршчыне працягваліся. Як і раней, частымі гасцямі тут былі ўкраінскія казакі. У сакавіку 1677 г. у адказ на скаргі феадалаў Вялікага княства Літоўскага вялікі гетман Д. Вішнявецкі загадаў, каб ніхто «ў Літоўскім Палессі і найперш у Мазырскім і іншых паветах Вялікага княства Літоўскага не асмельваўся спыняцца, выбіраць правіянт і ўчыняць якія-небудзь хоць бы самыя малыя крыўды». Гетман папярэджваў, што тых, хто будзе разбураць шляхецкія маёнткі, чакае жорсткая кара. Аднак гэтае ўказанне не дало жаданых вынікаў.

Страты насельніцтва павета да канца XVII ст. склалі 60 працэнтаў. Кароль Аўгуст II вымушаны быў выдаць у 1698 г. спецыяльныя прывілеі на вызваленне горада ад усіх павіннасцей «з нагоды нанесеных яму разбурэнняў і варожых спусташэнняў». Мазыр паступова рос, мацнеў, ажыўляўся.

Для планіроўкі горада першай паловы XVIII ст. характэрная так званая веерная сістэма, утвораная вуліцамі, якія разыходзіліся ад рыначнай плошчы ў розныя кірункі. У інвентары 1724 г. упамінаюцца вуліцы Кіеўская, Оўручская, Свідоўская, Нагорная і Гончая. Вуліцы праходзілі ўздоўж ракі і каля Замкавай гары, іх назвы ў інвентары не прыводзяцца. За межамі горада ўздоўж дарог знаходзіліся вялікія памесці. Упамінаюцца два замкі — Верхні (Стары), які знаходзіўся на Замкавай гары, і Ніжні. Відавочна, гэтыя назвы адлюстроўвалі толькі памяць пра тыя часы, калі яшчэ не быў знішчаны сапраўдны замак.

Каля падножжа Замкавай гары знаходзілася рыначная плошча, на паўночны захад ад яе, на месцы цяперашняй цэнтральнай плошчы, — адміністрацыйныя будынкі. Тут размяшчаліся но-




Копія плана Мазыра. 1769

вая гарадская ратуша, пякарня, канюшня. Акружалі плошчу 56 гандлёвых крам, тут знаходзіўся і шпіталь (багадзельня). У Мазыры быў шэраг культавых пабудоў: Мікалаеўская царква, царква св. Пятра, праваслаўны жаночы манастыр з царквой св. Пятніцы, заснаваны ў 1615 г. Фёдарам Абуховічам, царква св. Міхаіла, якая знаходзілася на Кіеўскай вуліцы, манастыр бернардзінцаў, касцёл езуітаў. На рыначнай плошчы размяшчаўся фарны (галоўны прыходскі) касцёл, заснаваны ў 1618 г. старастам Стравінскім — першая каталіцкая культавая пабудова ў Мазырскім старостве.

Участкі гарадской тэрыторыі, на якіх размяшчаліся двары мяшчан, вымяраліся ў прынтах (23,7 кв. м) і падзяляліся на пустыя, вольныя, аседлыя і бакавыя. Агульная колькасць іх у горадзе складала 2158 прынтаў, налічвалася 360 участкаў (пляцаў) пад забудову. Вольных — вызваленых ад усіх павіннасцей — 45 участкаў. Яны былі маёмасцю духоўных і свецкіх феадалаў. Такім чынам, у пачатку XVIII ст. трэць тэрыторыі Мазыра прыпадала на вольныя і пустыя плошчы, якія былі выключаны са сферы падаткаабкладання і выканання розных павіннасцей.

Памеры гарадскіх пляцаў былі неаднолькавымі. Сярэднія і буйныя мяшчанскія двары знаходзіліся на Оўручскай і Свідаўскай вуліцах, тут жылі і прадстаўнікі гарадской адміністрацыі. На Свідаўскай вуліцы знаходзіўся і дом маршалка павета і войта Мазыра Антонія Аскеркі. Найменшыя памеры ўчасткаў былі на Кіеўскай вуліцы. Была ў Мазыры карчма, млын, васкабойня.

Разам з рамесніцтвам гараджане займаліся сельскай гаспадаркай. За горадам знаходзілася 45 засценкаў (хутароў), найбольш буйныя — Бабры, Козенкі, Бакачы, Сушкі. Ва ўладанні жыхароў горада было 85 валок, ці 1815 га ворнай зямлі. Мяшчане з кожнай валокі плацілі па 5 злотых, з 1 прэнта гарадскога пляца — 1 грош. Агульная сума грашовай рэнты, паводле інвентарызацыі 1724 г., складала 1052 злотых. Недалёка ад горада размяшчаўся замкавы фальварак (памесце) і вёска Лучажэвічы.

Нацыянальны склад насельніцтва горада быў неаднародны. Большасць складалі беларусы, жылі ў Мазыры палякі, літоўцы, яўрэі. (У 1765 г. апошніх налічвалася 3074 чалавекі.) Упамінаецца, што сума падатковага збору з яўрэйскага насельніцтва горада склала 100 злотых. У горадзе было 170 дымоў (двароў). Сюды не ўвайшлі вольныя пляцы, вызваленыя ад падаткаў, а таксама бакавыя, дзе жыла частка гараджан. Агульная колькасць насельніцтва ў Мазыры складала каля 1,5 тыс. чалавек. На працягу наступных дзесяцігоддзяў назіраўся пастаянны яго рост, к канцу XVIII ст. гарадское насельніцтва складала каля 2,4 тыс. жыхароў.

Неспакойна было на Мазыршчыне ў сярэдзіне другой паловы XVIII ст. Пад уплывам падзей на Украіне пачаліся бунты і хваляванні прыгонных сялян, а таксама часткі збяднелага гарадскога насельніцтва. У лістападзе 1736 г. гетман Вялікага княства Літоўскага Радзівіл загадаў палкоўніку Слізне прывесці сваю харугву ў баявую гатоўнасць. Такія ж загады атрымалі і іншыя харугвы, якія павінны былі размясціцца ў Мазырскім павеце ўздоўж мяжы з Украінай, — улады ВКЛ асцерагаліся паходаў казацкіх атрадаў на Мазыр-

шчыну. Полк, які стаяў у Мазыры, быў не гатовы супрацьстаяць магчымаму паўстанню ў горадзе. У лютым 1738 г. у Мазырскі павет накіраваны з харугвай палкоўнік Неслухоўскі, пад камандаванне якога перадаваліся таксама харугвы маршалка Сангушкі, Панятоўскага і навагрудскага кастэляна Незабыткоўскага.

З гэтымі сіламі і татарскімі харугвамі, якія знаходзіліся ў Мазыры, Неслухоўскі павінен быў «пільна назіраць» за дзеяннямі паўстанцаў і не дапусціць гайдамакаў у межы Вялікага княства Літоўскага. У снежні 1747 г. гетман ВКЛ загадаў польнаму стражніку Барановічу накіраваць на падаўленне хваляванняў у Мазырскі павет яшчэ дзве харугвы: Бараноўскага і Лісоўскага. Летам 1750 г. ва ўрочышчы Кімбараўка (пад Мазыром) быў разбураны нядаўна пабудаваны манастыр. Відавочна, не абышлося без удзелу казакаў, яны і раней часта з'яўляліся ў горадзе. Атрад украінскіх казакаў пад камандаваннем Падаляка, хаваючыся ўдзень у чаротах Прыпяці, размясціўся ў ваколіцах Мазыра. Ужо быў захоплены казакамі Брагін, разбураны размешчаныя ўздоўж ракі многія маёнткі феадалаў.

Мясцовыя ўлады разам з накіраванымі раней у Мазыр войскамі не маглі справіцца з хваляваннямі. У сакавіку 1751 г. паслы ад Мазырскага павета скардзіліся літоўскаму гетману на пастаянныя набегі гайдамакаў і бунты падданых, прасілі прыслаць падмацаванне. Гетман накіраваў у Мазыр палкоўніка Бараноўскага з чатырма харугвамі ВКЛ. Войскам было неабходна прыбыць у Мазыр 12 мая і паступова граміць атрады паўстанцаў і гайдамакаў. Але зрабіць гэта было нялёгка. Падсуддзя Мазырскага павета Я. Прыжыбора пісаў у снежні 1755 г. сакратару рускага пасольства ў Рэчы Паспалітай Ржычэўскаму, што «показанные в реестре, собственные мои поданные» ўцяклі ў Расію, сталі гайдамакамі і, вярнуўшыся назад, разбураюць маёнтак. Прыжыбора прасіў абараніць яго жыццё і маёмасць.

У 1756 г. пачалося паўстанне сялян у мазырскіх уладаннях князя Радзівіла. Мясцовыя ўлады не змаглі нічога зрабіць. За справу ўзяўся сам князь Радзівіл, паўстанне было падаўлена, а яго кіраўнікі пакараны. Варшаўскі сейм 1764 г. прыняў спецыяльнае рашэнне аб забеспячэнні парадку ў рэгіёне. А ў 1769 г. паўстанцы захапілі цэлую валасць Мазырскага павета — Камянецкую.

Заканчвалася XVIII стагоддзе. Мазыр паступова станавіўся добраўпарадкаваным горадам, цэнтрам культурнага і гаспадарчага жыцця краю. У канцы стагоддзя ён быў уключаны ў склад Расійскай імперыі. Вакол горада цясніліся прыгарадныя пасяленні: Калачоўка (Сідзельнікі), Ясеньшчына, Пянькі, хутары Матрункі, Козенкі, Бабры, Булаўкі, Пранькі, Лучажэвічы, Целяпуны. У Мазыры вылучаліся вуліца Пятніцкая (цяпер Куйбышава), Слуцкая (Савецкая — ад Прымаставой плошчы да плошчы Леніна), найбольш густанаселеная Кіеўская (ад цэнтральнай плошчы да рынку), якая была забудавана толькі з боку ракі, Жытомірская (Горкага), Базарная плошча. Было многа цэркваў і манастыроў. Жыхароў налічвалася каля 1,5 тыс. чалавек. Усяго ў Мазыры было каля 220 двароў, 6 царкоўных участкаў, ратуша, дзве цагельні.

Частыя войны і хваляванні, пастоі войск і прыцясненні з боку феадалаў прывялі ў заняпад гаспадарку. Сейм 1762 г. вызваліў жыхароў горада ад падаткаў у каралеўскую казну. У 1776 г. амаль усе гарады Беларусі былі пазбаўлены Магдэбургскага права, Мазыр і яшчэ некалькі гарадоў не ўвайшлі ў гэты пералік. Павольна аднаўлялася жыццё гараджан. Асноўным заняткам, як і раней, заставалася рыбная лоўля, гандаль буйной рагатай жывёлай і коньмі. У мястэчку Скрыгалаў збіралася два кірмашы — 9 мая і 6 снежня, куды прыязджалі купцы з многіх гарадоў

**Польшчы і Беларусі. Тут, а таксама ў Мялешкавічах, Міхалках, Барбарове кожны тыдзень праводзіўся гандаль.**

Гарадскія і павятовыя старасты, якія кіравалі Мазыршчынай у складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: Альберт Гаштольд (1530), Мікалай Радзівіл Чэрні (1544), Мікалай Нарбут (1547), Мікалай Радзівіл (1566), Мікалай Радзівіл (1581—1587), Вальцар Стравінскі (1607), Яўстахій Ян Тышкевіч (1613), Бальтазар Стравінскі (1620), Аляксандр Смашко (1636), Геронім Кароль Хадкевіч (1648), Маціяш Троцкевіч (1653), Станіслаў Ліпскі (1672), Міхаіл Халецкі (1690—1697), Фларыян Леон Катоўскі (1696), Пётр Кароль Катоўскі (1696), Міхаіл Чалецкі (1698—1710), Гервазій Людвік Аскерка (1724—1738), Ежы Антоні Аскерка (1765—1771), Гедзэн Яленскі (1772—1785), Казімір Аскерка (1773), Ян Яленскі (1787—1794).

Павятовыя маршалкі: Ян Каленскі (1592), Стэфан Лозка (1598), Канстанцін Катоўскі (1664), Станіслаў Ліпскі (1674), Ян Рабецкі (1675), Іеранім Канстанцін Катоўскі (1696), Рафал Алазізі Аскерка (1738—1767), Казімір Чалецкі (1771—1776), Мацей Казімір Аскерка (1772—1793).

Займалі пасаду кастэляна мазырскага: Фелікс Яленскі (1807), Піліп Абуховіч (1809—1811), Казімір Кланскі (1822), Гжегорж Навакоўскі (1822—1923).

**У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1793 г., Мазыр і тэрыторыя Мазырскага павета перайшлі ў склад Расійскай імперыі.**

* * *

У канцы XVI ст. у Мазыры жыў Стэфан Лован, земскі суддзя. У 1592 г. па даносу Стэфана Лозкі, які абвінавачваў Лована ў атэізме, ён быў выкліканы ў Галоўны літоўскі трыбунал. У віну Ловану ставілася, быццам ён сцвярджаў: «души в человеку, раю и пекла нет, и судного дня не будет, и человек же, яко пёс кровью... сходит, и что колвек есть на свете, то всё само праз себя, земля, древо, вода и иншие речи, и так веки веком будет, и кому же лихо тут пекло, а кому добре тут рай...» Далейшы лёс Стэфана Лована невядомы...

Трагічны лёс прывёў 28 верасня 1794 г. у нядобрай славы Салавецкі манастыр 38-гадовага збяднелага мазырскага шляхціца Язэпа Яленскага — «для непреходного под стражей пребывания». Восенню 1792 г. Яленскі накіраваўся ў Санкт-Пецярбург, дзе пад уражаннем падзей французскай буржуазнай рэвалюцыі і польскага паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі пачаў займацца дзейнасцю, якая супярэчыла законам імперыі. У 1794 г. па даносу капітана Цыбульскага Яленскі быў арыштаваны, у яго знайшлі некалькі крамольных рукапісаў. Адзін з іх напісаны ў форме маніфеста і адрасаваны каралю Рэчы Паспалітай. У ім гаварылася аб неабходнасці ліквідацыі прыгоннага права, кароль прызнаваўся роўным з людзьмі іншых саслоўяў. У рукапісе гаварылася пра «свабоду, роўнасць, братэрства». Другі дакумент — прысяга караля, які адмяніў прыгоннае права, аб'явіў свабоду веравызнання (што было вельмі важным для Беларусі) і роўнасць грамадзян; павінны былі быць спалены ўсе паперы, якія замацоўвалі правы памешчыкаў на зямлю і сялян, зацверджана выбарнасць духоўных (царкоўных) і грамадзянскіх пасадавых асоб. Трэці дакумент — незакончаны зварот да ўсіх народаў Рэчы Паспалітай. У ім пісалася: «И чего ж, любезнейшие братья, в течение тысячи с лишним лет вашей неволи не испытывали, чего не перетерпели ... Например, не одного из вас, невольников, горяч барин, рассердясь на лошадь, человека убил, за небрежный удар собаки барской — человека замучил, за неснятие шапки перед барином до смерти засек, за разбитие стакана — зубов нескольких или жизнь терял ... И того не случалось ли, ежели барину понравилась ваша жена, сестра или какакая-нибудь девка, а вы ... не согласились или не дозволили на беззаконие, сколько то вас тысяч умертвлено, и один ли с вас променен на лошадь, на собаку, на свинью, на какую-нибудь безделицу барину, один ли на карту поставлен, продан на деньги, от жены, детей, от родителей и родни, несмотря на слезы и плачевные рыдания хуже, как скатину какую».

Яленскаму пагражала шыбеніца, але ён напісаў у маі 1794 г. прашэнне аб прыняцці праваслаўнай веры і ссылцы ў манастыр. Улады згадзіліся. Атрымаўшы праваслаўную веру, Яленскі назваўся Аляксеем. У Салавецкім манастыры, куды яго адправілі ў ссылку, бунтар не адмовіўся ад сваіх поглядаў. 27 чэрвеня 1794 г. ён перадаў архімандрыту рукапіс «Благовесть к Израилю российскому», нібыта атрыманую ад аднаго камердынера. Павел I, прачытаўшы рукапіс, гаварыў «о дерзости, неистовстве, коварстве сочинителя». У гэтым дакуменце прапаведавалася пра адзінства славянскіх народаў у барацьбе супраць царызму. Крытыкуючы непарадкі, аўтар нічога не мог сказаць пра будучае краіны. Пасля смерці імператара Паўла ў 1801 г. трон заняў Аляксандр I. Яленскі быў вызвалены з Салавецкага астрога. Стомленасць, беднасць, расчараванне (задушана паўстанне Касцюшкі, не вырашыла многія праблемы французская рэвалюцыя, ніякай упэўненасці на перамены ў палітычным і сацыяльным жыцці ў Расійскай імперыі) зламалі дух бунтара. Яленскі доўгі час блукаў па краіне, пакуль не трапіў у Аляксандра-Неўскую лаўру, дзе ён стаў прыхільнікам фанатычнай секты скапцоў. У 1804 г. за распаўсюджванне скапічнай ерасі яго выслалі ў Суздаль, у Спаса-Яфім'еў манастыр, дзе Яленскі і памёр 23 сакавіка 1813 г.

*А. Бобр, М. Сузько*

**Герб Мазыра**

У Вялікім княстве Літоўскім, куды з XIII ст. уваходзілі землі Мазыршчыны, гербы і гербавыя знакі меў 41 горад. Герб — гэта знак, які адлюстроўвае ў сімвалах час стварэння і акрэслівае сацыяльную і мясцовую прыналежнасць асобы, горада або дзяржавы; горад, які яго мае, узняўся ў сваім дзяржаўна-палітычным развіцці на якасна новую прыступку. У перыяд феадалізму набыццё горадам герба было сведчаннем яго росту ў параўнанні з суседнімі пасяленнямі. Беларускім гарадам гербы звычайна даваліся разам з Магдэбургскім правам.

У Прывілеі, які давала Мазыру Магдэбургскае права, гаворыцца: «Надаем тому месту нашому печать месткую, то есть Орел ... с вырысованым S, которую урад месткій на судах і іных справах і потребах печатовать і того гербу ужівать мают вечные часы ...» Ёсць і другі Прывілей, які быў выдадзены Мазыру каралём Міхаілам Корбут-Вішнявецкім. У ім сказана, што гораду даецца герб — у блакітным полі чорны арол з чырвонаю шыльдаю на грудзях. Для даследчыкаў геральдыкі вельмі важнай аказалася фраза, што мазыранам гэты герб дазволіў ужываць подпіс «вяльможа трокскі староста Мазырскі».

На мазырскім гербе ў блакітным полі чорны аднагаловы арол з срэбранай шыльдай на грудзях, на ёй чырвоная літара S. Затым — срэбраная шыльда была заменена на чырвоную. Знак быў сімвалам каралеўскай улады і сведчыў, што горад 10 верасня 1609 г. атрымаў герб ад караля Сігізмунда III.

Вылучаюць у асноўным два тыпы гербаў — функцыянальныя і штучныя. Функцыянальныя гербы перадаюць якую-небудзь адметную рысу геаграфічнага становішча, ролю горада ў абароне дзяржавы, гандлі, гаспадарцы. Абарончымі сімваламі на беларускіх гербах выступалі выявы вежаў, брам, гарадскіх муроў. Штучныя гербы —




Герб Мазыра

больш умоўныя, звычайна маюць выяву святога, магчыма, заступніка ці ўладальніка горада. На гербе Мазыра спалучаюцца каралеўская і велікакняжацкая атрыбутыка.

На пячатцы мазырскай ратушы, прыкладзенай да дакумента 1639 г., бачна выява арла з радзівілаўскім гербам — так званыя «ражкі». Вядома, што Радзівілы мелі на гербе чырвонага арла, на грудзях якога — шыльда з выявай трох паляўнічых ражкоў. Поле герба залатое, шыльда — чырвоная, лапы і дзюба арла — залатыя. Гэта сведчыць аб параўнальнай слабасці каралеўскай улады і моцы магнатаў, якія маглі зняважыць каралеўскі ініцыял і замяніць яго выявай уласнага герба.

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) Беларусь, у тым ліку Мазыр, далучаны да Расійскай імперыі. Былі заменены амаль усе

гербы беларускіх гарадоў. Абавязковым атрыбутам новых гербаў, аформленых па агульнарасійскім узоры, з'яўляецца наяўнасць двухгаловага арла. 22 студзеня 1796 г. набыў нóвы герб і Мазыр, хаця ён захоўваў элементы старога: у верхняй частцы шчыта — двухгаловы арол, у ніжняй — стары герб: на блакітным фоне чорны аднагаловы арол з чырвонай шыльдай на грудзях.

*В. Шур*

## З ЗАЯВЫ ВАЯВОДСТВАЎ І ПАВЕТАЎ ПРА ІХ ЗГОДУ НА ВЫПЛАТУ ПАДЫМНАГА ПАДАТКУ 1661 г.

...Мозырский повет, как ранее, так и в настоящее время, находясь в руках неприятеля, не может ни платить налогов, ни нести службу в ополчении и уже в прошлом освобождался от уравнения. А теперь изгнанники при условии возврата своих владений и абъюраты в отношении опустошенных и сожженных неприятелем обязуются, если будет из чего... принять посильное участие в уплате подымного на жалованье для войска и оказать иное содействие налогами. Поскольку отчетный сеймик не может состояться в Мозыре ввиду нахождения там врага, а до Кобрина далеко, он должен собраться в Ляховичах, там же и сеймик для выборов послов в будущий сейм...

*Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 185.*

## КОЛЬКАСЦЬ ДЫМОЎ У ВАЯВОДСТВАХ І ПАВЕТАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І АГУЛЬНАЯ СУМА ЗБОРУ З ІХ ПАДАТКАЎ, УСТАНОЎЛЕНЫХ ГЕНЕРАЛЬНАЙ СЕСІЯЙ ВАРШАЎСКАГА СЕЙМА Ў 1717 г.

Мозырский повет: гиберна — 4000 злотых; чоповое и шеляжное — 3300 злотых; дымов земских — наследственных, шляхетских, духовных и королевских экономий (с дыма по 7 злотых и 20 грошей) — 1000, злотых — 7666.

*Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 194—195.*

## З ПАСТАНОВЫ ВАРШАЎСКАГА КАНВАКАЦЫЙНАГА СЕЙМА АБ УЗМАЦНЕННІ АХОВЫ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА АД НАБЕГАЎ ГАЙДАМАКАЎ. 1764 г.

Поскольку пограничный Мозырский повет не охраняется от набегов гайдамаков, уже неоднократно имевших место, поэтому, проявляя заботу о безопасности, мы поручаем вельможному гетману Вел. кн. Лит., чтобы он обеспечил безопасность этого повета в соответствии с его требованиями и настояниями при помощи постоянных войск Вел. кн. Литовского.

*Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 401.*

## ПІСЬМО ПАДСУДДЗІ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА ЯНА ПРЖЫБОРА САКРАТАРУ РАСІЙСКАГА ПАСОЛЬСТВА Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ РЖЫЧЭЎСКАМУ АБ ЗВАРОЦЕ ПРЫГОННЫХ СЯЛЯН, ЯКІЯ ЗРАБІЛІ НАПАД НА ЯГО ДОМ, А ЗАТЫМ ЗБЕГЛІ Ў РАСІЮ

*1755 г., декабрь 14*

Не получа от Вас на письма мои ответу, ныне в третий раз с нижайшем моим почтением приемлю смелость к Вам писать, в той надежде пребывая, что не получу ли я хоть ныне в прошении моем ныне резолюции, я в прежних моих письмах писал, прося о милостивом защищении, и доносил, что показанные в реестре собственнные мои поданные и что в том же реестре изображены 2 войты, в гайдамаки обратились и разбивают, которые более меня устрашают, нежели самые гайдамаки, ибо о гайдамаках издали только слышно, а они имеют в деревнях моих своих родных братьей и сродственников и, находясь в близости за границею, могут ведать каждого дня, где я обращаюсь. И для того я принужден находиться во всегдашней опасности и себя беречь, а особливо от соседов моих, имея

известие, что им поданные их доносят, что помянутые мои 2 войта с протчими всеконечно намерены меня живота лишить, кои уже и ожидали приезду моего из Кенигсберга, укрываясь в леса: чрез 2 недели и у своих сродственников и чиня разные грабительствы, а потом, не дождавшись меня, дом покрали, ружье забрали, також и церковь покрали и паки заграницу назад возвратили, у которых на форпосте Добранском пару ружей отняли.

Я не столь настою о выдаче их, сколь стараюсь о безопасности живота моего и потом нижаише донесть о том двору вашему, чтоб мне сатисфакция доставлена была...

*Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 400—401.*

## Ці помнім мы ўсіх?

З гісторыяй Мазыршчыны XVI ст. звязаны імёны многіх выдатных дзяржаўных і палітычных дзеячаў Вялікага княства Літоўскага — літаратараў, кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў на Беларусі, прадстаўнікоў кіруючай эліты.

Прадстаўнік вядомага роду Гаштольдаў — Альбрэхт (памёр у 1539 г.) быў ваяводам навагрудскім, полацкім, трокскім, віленскім, канцлерам літоўскім, а ў 1515 г.— старастам мазырскім. Альбрэхт Гаштольд удзельнічаў у руска-літоўскай вайне 1507—1508 гг. На Віленскім сейме ў 1529 г. абвясціў Сігізмунда II Аўгуста наследнікам літоўскага трона, рэдагаваў Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г. Як паведамляецца ў «Кароткай энцыклапедыі БССР», род Гаштольдаў згас у 1542 г., іх уладанні перайшлі да вялікага князя.

З мазырскай шляхты быў вядомы дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, дыпламат і пісьменнік Філіп Казімір Абуховіч. Ён скончыў Замойскую акадэмію, з 1649 г. (у некаторых крыніцах з 1651—1653 гг.) — пісар Вялікага княства Літоўскага. Ездзіў паслом княства ў Венецыю і Маскву. З 1653 г.— ваявода смаленскі, узначальваў абарону горада і пасля доўгай асады здаў яго рускім войскам. Абуховіча абвінавацілі ў здрадзе, але неўзабаве апраўдалі. Відавочна, яму адрасавана ананімнае «Пасланне да Абуховіча». «Нешта, пане, ето родом дому деется! Дзед Твоей Мілості, колі генералом быв в Мозыру, то,— слышав,— што за малые грошы неправду продавав. Пан отец Вашмості, судею будучы мозырскім за моей памяті, у кого больш взяв, того хороше осудів. Колі небошык з таго света уступів, мозыране вельмі рады былі!..» Памёр Філіп Казімір Абуховіч у 1656 г.

У 30-х гадах XVI ст. намеснікам мазырскім быў Юрый Радзівіл (1480—1541), сын Мікалая Старога, прадстаўнік буйнейшага магнацкага роду Вялікага княства Літоўскага. Юрый Радзівіл быў дзяржаўцам лідскім, скідзельскім, беліцкім. Кіраваў маёнткам, сачыў за своечасовым зборам падаткаў, адказваў за абарону ўручаных яму земляў, з'яўляўся начальнікам мясцовага дзяржаўнага кіравання і суда. За перамогі ў 30 бітвах яго празвалі Пераможцам.

Сын Юрыя Радзівіла — Мікалай Рыжы (1512—1584) быў старастам ашмянскім, слонімскім, барысаўскім і мазырскім. У час падрыхтоўкі і заключэння Люблінскай уніі 1569 г. стаяў на чале па-сепаратысцку настроеных магнатаў. Да 1579 г. кіраваў падрыхтоўкай Статута ВКЛ, з пачатку 70-х гадоў XVI ст.— неабмежаваны правіцель княства.

Іван Мялешка — ураджэнец Смаленшчыны, меў некалькі маёнткаў, у тым ліку Жыровічы. У 1598 і 1601 гг. займаўся размежаваннем зямель паміж Мазырскім паветам і Кіеўскім ваяводствам, быў падкаморыем мазырскім. Выступаў супраць засілля польскіх феадалаў у Беларусі. Яму прыпісваюць сатырычны твор «Прамова Мялешкі», дзе ёсць упамінанне пра Мазыр. Гэта твор вялікага сацыяльнага палітычнага гучання, аўтар смела высту-

пае супраць замежных парадкаў у Беларусі, высмейвае норавы мясцовых феадалаў.

У Мазыры жыў Стэфан Рыгоравіч Лован (Ян Лавейка). Ён служыў у Мазырскім земскім судзе, у гісторыю ўвайшоў як матэрыяліст і атэіст. Спачатку Лован прытрымліваўся радыкальнага пратэстантызму, затым — эпікурызму. У 1591 г. прыцягнуты да адказнасці віленскім Галоўным літоўскім трыбуналам за тое, што не верыў у Хрыста, бессмяротнасць душы, уваскрасенне з мёртвых, судны дзень. Лічыў, што свет не створаны Богам, а існуе вечна. Сутнасць поглядаў Лована выкладзена ў трактаце «Позаў аднаму рускаму секты эпікураванай».

*М. Сузько*

## Мітрапаліт Кіеўскі і Усея Русі Макарый

У цэнтры вёскі Скрыгалаў захавалася старадаўняя цагляная капліца. Ва ўрочышчы Падселіца на беразе старадаўняга рэчышча Прыпяці ўзвышаецца абеліск... Абодва помнікі пабудаваны ў 1897 г. да 400-годдзя гібелі ў гэтай вёсцы мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя.

...У другой палове XV ст. з-за пастаянных набегаў і грабяжоў крымскіх качэўнікаў жыццё ў Кіеве стала немагчымым. Цэнтр рускай праваслаўнай царквы часткова перамясціўся ў Вільню, там знаходзіліся мітрапаліты царквы, якая, як і раней, называлася Кіеўскай. Архімандрытам віленскага Свята-Троіцкага манастыра быў Макарый. У пачатку 1495 г. саборам епіскапаў праваслаўнай царквы ён быў «рукоположен» на Кіеўскую мітрапалітаўскую кафедру і стаў мітрапалітам Кіеўскім і Усея Русі. Мітрапаліт адстойваў праваслаўе, актыўна супрацьдзейнічаў пашырэнню каталіцкай царквы на тэрыторыі Украіны і Беларусі.

Вясной 1497 г. Макарый вырашыў наведаць Кіеўскую кафедру і прыходы, галоўным чынам тыя, што пацярпелі ад набегаў татар. Па дарозе ён спыняўся ў праваслаўных прыходах, правіў богаслужэнні. Такі прыпынак быў зроблены і ў Скрыгалаве, хоць паблізу лютавалі татары. Летапісец у Супрасельскім летапісе гаворыць: «...В 1497 г. мая 1-го на шестой неделе после Великага дня в понедельник безбожные перекопские татары убили преосвященного митрополита Киевскага и Всея Руси архиепископа Макария. Вторглись они в нашу землю скрытно от всех и настигли его в селе Скрыгалове на реке Бчичь за пять миль от Мозыря, из бывших с ним одних убили, а других взяли в плен».

Падрабязнасці той даўняй трагедыі ў народнай памяці на працягу стагод-



Помнік каля в. Скрыгалаў на месцы забойства мітрапаліта Макарыя

дзяў ператварыліся ў легенды, яны жывуць да сённяшняга дня. Паводле адной з іх насельніцтва Скрыгалава схавалася ад татар у царкве, дзе ў гэты час знаходзіўся мітрапаліт Макарый. Ворагі патрабавалі ад мітрапаліта заклікаць насельніцтва пакарыцца, заплаціць даніну і даць праваднікоў, каб рухацца ў глыбіню беларускіх земляў. Гэта гарантавала б насельніцтву і гасцям з Вільні выратаванне. Высока падняўшы над галавой крыж, Макарый сказаў: «Святы крыж не дазваляе, каб ворагі веры праваслаўнай ішлі далей і знішчалі яе жыхароў. Далей дарогі няма...» Раз'юшаныя ворагі накінуліся на Макарыя, павялі яго да ракі, адсеклі галаву і на дошцы пусцілі ўніз па цячэнні Прыпяці: «Ты ехаў у Кіеў, туды мы цябе і адпраўляем!» Тым часам людзі разбегліся па навакольным лесе...

Паводле другога падання Макарый выйшаў наперад людзей і смела сказаў ворагу: «Хочаце праваслаўнай крыві, праклятыя, бярыце маю! Народ не чапайце... Бог і народ вечныя!»

Гавораць і так, што Макарый заклікаў насельніцтва не карміць татарскіх коней, каб ворагі не маглі ехаць далей, выклікаў гэтым гнеў качэўнікаў...

Ёсць і іншыя версіі, але сутнасць іх адна — мітрапаліт Кіеўскі і Усея Русі Макарый загінуў у Скрыгалаве, ратуючы яго жыхароў, увесь народ Беларусі ад знішчэння крымскімі татарамі, здзейсніў вялікі патрыятычны і маральны подзвіг.

Цела мітрапаліта перавезлі ў Кіеў і паклалі ў саборным храме св. Сафіі. Святыя мошчы Макарыя пакояцца цяпер ва Уладзімірскім кафедральным саборы Кіева.

*М. Капач*

## У складзе Расійскай імперыі

У першай палове XIX ст. Мазыр па-ранейшаму не адыгрываў значнай ролі ў эканамічным, палітычным і духоўным жыцці Мінскай губерні. Аднак вяртанне Мазыршчыны ў склад рускай дзяржавы паклала своеасаблівы адбітак на жыццё гэтага аддаленага, правінцыйнага краю. Згодна з распараджэннем генерал-пракурора сената князя А. Б. Куракіна ад 25 сакавіка 1798 г. Мінскай губернскай чарцёжнай да 1800 г. быў складзены атлас Мінскай губерні, дзе ўпершыню дадзена падрабязная характарыстыка Мазыра і яго мясцовасці.

У канцы XVIII—пачатку XIX стст. пад забудовамі горада было занята 52 дзесяціны. 8707 дзесяцін зямлі павета знаходзілася пад выганамі і ворывам. У горадзе меліся тры мураваныя і адзін драўляны манастыр, пяць драўляных праваслаўных цэркваў, тры мураваныя і адзін драўляны каталіцкі касцёл, дзве яўрэйскія і хрысціянскія народныя школы. Быў толькі адзін мураваны двор, астатнія — драўляныя, з іх 543 належалі хрысціянам, 84 — яўрэям, 38 — шляхце. Налічвалася 7 яўрэяў-купцоў, 841 мешчанін-хрысціянін і 160 яўрэяў-мяшчан, 128 шляхціцаў (мужчынскага роду).

Атлас 1800 г. вызначае маёмаснае становішча гараджан у залежнасці ад адносін да зямлі: на «купленных землях стояли 3 мещанские (обывательские) и 18 еврейских усадеб». 2 шляхецкія двары знаходзіліся ў юрысдыкцыі ксяндзоў-бернардзінцаў, 22 дамы мяшчан і 3 яўрэйскія дамы стаялі на царкоўных землях. Большасць жылых пабудоў, такім чынам, з'яўляліся спадчыннымі ўладаннямі. Эканамічная запіска да атласа паясняе, што ў склад горада ўваходзіла 260 двароў з 607 душамі мужчынскага і 646 душамі жаночага полу. Мяшчанам-хрысціянам належала 157 двароў (357 мужчын і 320 жанчын), яўрэям — 84 дамы (242 мужчыны